Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ЛІПЕНЯ 2012 г. СЕРАДА № 136 (27251) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Мелавыя кар'еры з белым пляжам і незвычайна блакітнай вадой былі ў Краснасельскім не адзін год. Але яны з'яўляліся экзатычным раем толькі для абраных — тых нямногіх, хто ведаў пра іх. Аднак пара фотаздымкаў у сецыве змяніла ўсё...** СТАР 5



**«Я рос у Савецкім Саюзе, калі ў Беларусі быў добры жаночы і мужчынскі баскетбол. Шкада, што цяпер традыцыі падтрымліваюць толькі жанчыны. У іх такія характары, што іх яшчэ спыняць давядзецца. Яны змагацца заўжды будуць да апошняга. Так і ёсць».** СТАР 8

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтрвыбаркама Беларусі:**

***«Выбарчыя камісіі да ўсіх кандыдатаў у дэпутаты падыдуць з роўнай меркай, будуць прымяняць аднолькавы стандарт. Будзе крыўдна, калі выбаршчыкі будуць расчараваны ў выбарах. Яны павінны выбіраць з лепшых. Гэта выбары ў ідэале».***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 19° |
| Віцебск | +17° |
| Гомель | +19° |
| Гродна | + 17° |
| Магілёў | +18° |
| Мінск | +17° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.07.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8300,00 | ▼ |
| Еўра | 10210,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 255,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1025,77 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X



Фота БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «Беларусь не мае намеру прадаваць кантрольны пакет акцый ААТ «Беларуськалій»

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі заявіў, наведваючы ўчора Бярозаўскі руднік ААТ «Беларуськалій».**

«Я не збіраўся і не збіраюся прадаваць «Беларуськалій» камусьці за бясцэнак. Калі хто-небудзь захоча — плаціце грошы, цана названа, ніхто яе змяншаць не будзе», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што размова ідзе аб магчымасці продажу толькі пэўных доляў акцый, але не кантрольнага пакета.

Як адзначыў Прэзідэнт, апошнім часам гучыць шмат меркаванняў аб прыватызацыі «Беларуськалія». «Лічыў і лічу, што гэта жамчужына Беларусі, якая належыць беларускаму народу. Цяпер вельмі шмат размоў і нават націску, і націск ідзе з розных бакоў, нават з тых дзяржаў, ад якіх мы вельмі залежныя. І гэтаму націску працістаяць складана», — сказаў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што раней даручаў правесці ацэнку прадпрыемства, і кошт склаў $30-32 млрд. «Ніжэй нікуды. Хочаце — калі ласка, мы вам прададзім не кантрольны пакет акцый, каб кіраванне не страціць. Давайце 10 працэнтаў, 20 працэнтаў, 25 працэнтаў, але плаціце, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — 25 працэнтаў гэта $8,5-9 млрд. Хто хоча, прыходзьце, плаціце. Такіх пакупнікоў не знайшлося. Усе хочуць за $8 млрд купіць увесь камбінат. Я гавару: бывайце, такіх цэн няма. Гэта мая прынцыповая пазіцыя. Мне няма сэнсу спяшацца прадаваць «Беларуськалій», — дадаў Прэзідэнт. Пры гэтым ён удакладніў: «Гэта не таму, што я баюся страціць кіраванне, уладу, як некаторыя пішуць. Справа не ў тым: я яго не будаваў, не ствараў — тут цэлае пакаленне ўклала сваю працу, і прадаваць за бясцэнак ніхто яго не будзе. Вось маё цвёрдае слова, сказанае публічна».

Аляксандр Лукашэнка таксама не выключае магчымасці перагляду адносін з расійскім акцыянерам Беларускай калійнай кампаніі «Уралкалій». «Усе пытанні, якія датычацца БКК, павінны быць да 1 верасня вырашаны ў адзін ці другі бок. Больш валтузні вакол гэтага быць не павінна, нават калі нам давядзецца нашы адносіны з расіянамі («Уралкаліем». — **Заўвага БЕЛТА**) перагледзець. Давайце будзем разбірацца капітальна адносна гэтага. Нам патрэбна поўная яснасць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Хочуць працаваць асобна, няхай працуюць. БКК павінна быць захавана ў любым выпадку. Таму што калійная кампанія павінна займацца не толькі продажам калійных угнаенняў, але таксама складанымі, змешанымі ўгнаеннямі», — сказаў Прэзідэнт. СТАР 2

## З 9 жніўня змяняецца дзяржпошліна за атрыманне і замену вадзіцельскіх правоў

**Дзяржпошліна за атрыманне і замену вадзіцельскіх правоў у Беларусі з 9 жніўня складзе Br200 тыс., паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў.**

У МУС растлумачылі, што ў Беларусі кошт паслуг, якія аказваюцца дзяржаўнымі органамі, у тым ліку і падраздзяленнямі ДАІ (выдача вадзіцельскіх пасведчанняў, нумарных знакаў і інш.), у асноўным залежыць ад базавай велічыні. Памеры дзяржпошлін рэгулююцца двума дакументамі: Падатковым кодэксам і Указам № 200 «Аб адміністрацыйных працэдурах, ажыццяўляемых дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па заявах грамадзян».

«Новым Падатковым кодэксам, які ўступіў у сілу з 1 студзеня 2012 года, быў прадугледжаны памер дзяржпошліны за атрыманне (замену) вадзіцельскага пасведчання ў памеры 4 базавых велічынь. Гэтыя змяненні прапрацоўваліся і былі ўнесены яшчэ ў мінулым годзе, да рашэння аб павышэнні памеру базавай велічыні», — растлумачылі ў МУС. Паколькі з 1 красавіка памер базавай велічыні быў устаноўлены Br100 тыс., гэта прывяло б да аплаты грамадзянамі дзяржпошліны за вадзіцельскае пасведчанне ў памеры Br400 тыс.

«З улікам гэтага МУС выйшла з ініцыятывай у Савет Міністраў аб зніжэнні памеру дзяржпошліны за атрыманне (замену) вадзіцельскага пасведчанння», — расказалі ў міністэрстве. Прапанова МУС была рэалізавана ва Указе № 197 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 красавіка 2010 года № 200». Гэты ўказ быў афіцыйна апублікаваны 8 мая ў Нацыянальным рэестры прававых актаў Рэспублікі Беларусь. Праз 3 месяцы пасля свайго афіцыйнага апублікавання (гэта значыць 9 жніўня) ён уступіць у сілу.

**Кар. БЕЛТА.**

## РАЗВЕДКА ДЫЯЛОГАМ

**Учора, 17 ліпеня, прадстаўнікі ацэначнай місіі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (БДІПЧ АБСЕ) сустрэліся з дэпутатамі ніжняй палаты беларускага парламента.**

Спаслаўшыся на тэхнічны характар сустрэчы, старшы саветнік па выбарах БДІПЧ Армін РАБІЧ папрасіў журналістаў пакінуць месца перамоў. Не стаў прадстаўнік самай буйной рэгіянальнай арганізацыі па бяспецы каментаваць і вынікі размовы з беларускімі парламентарыямі. СТАР 2

## «УРОК БУДУЧЫНІ» АД ПАРКУ ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ

**Напрыканцы мінулага года па ініцыятыве Парку высокіх тэхналогій і пры падтрымцы Міністэрства адукацыі ў настаўніцкім асяроддзі краіны быў рэалізаваны эксперыментальны праект-конкурс «Урок будучыні». Аб яго папярэдніх выніках нашаму карэспандэнту прадставіў спраўздачу намеснік дырэктара Парку Аляксандр Марцінкевіч. Вось асноўныя моманты гэтага дакумента.**

Навошта ўвогуле спатрэбілася рэалізацыя праекта пад такой узнёслай назвай? Як вядома, мы жывём у век імклівага развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Настолькі імклівага, што адставанне ў гэтай сферы недаравальнае, бо яно пагражае ўсім нам сур'ёзнымі эканамічнымі і іншымі стратамі і непрыемнасцямі ўжо ў недалёкай будучыні. СТАР 3

## АЙЧЫННАЕ ВІНО ПАВОЛЬНА ЗАГІНЕ?

**З Талачынскага кансервавага завода я прывезла... этыкетку да віна пладовага мацаванага палепшанай якасці «Талачынка». Менавіта «да» віна, а не «ад», паколькі на бутэльцы яна не была — яркую паперку прэзентавалі непасрэдна на прадпрыемстве, у тым цэху, дзе яна становіцца апошнім штрыхом да гатовага вырабу.**

Этыкетка, можа быць, і не шэдэўр, але ўсё ж такі абноўленая. Як і сама бутэлька (яна цяпер такая, як у вінаграднага віна), як і спосаб закаркоўвання — замест колішняй «нахлабучкі» з 1 чэрвеня прымяняецца корак з тэрмаўсадачным каўпачком. Словам, вытворца імкнецца зрабіць усё, каб наша беларускае пладова-ягаднае віно перастала звацца крыўдным словам «чарніла». СТАР 3

# «Беларусь не мае намеру прадаваць кантрольны пакет акцый ААТ «Беларуськалій»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Беларуская калійная кампанія, па яго меркаванні, — гэта брэнд, і сёння наўрад ці нехта можа ад яе адмовіцца. «Або яны («Уралкалій». — **Заўвага БЕЛТА**) працуюць разам, або ідуць у свабоднае плаванне, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але яны на гэта не пойдуць. Ім не патрэбны гэты разрыў. Значыць, трэба ісці сумленным шляхам. Таму да 1 верасня ўсе пытанні павінны быць зняты. Я аб гэтым 18 ліпеня буду гаварыць з прэм'ер-міністрам Расіі», — дадаў Прэзідэнт.

Як далажылі Прэзідэнту, цяпер ААТ «Беларуськалій» пачало рэалізацыю інвестыцыйнага праекта будаўніцтва ў Гомельскай вобласці горна-абагачальнага комплексу магутнасцю не менш як 1,5 млн т хларыду калію ў год на базе Петрыкаўскага радовішча калійных солей. Вядзецца распрацоўка бізнэс-плана, тэхніка-эканамічнага абгрунтавання, па міжнародных стандартах праводзіцца ацэнка запасаў на радовішчы. У далейшым плануецца аб'явіць конкурс па выбары суінвестара для рэалізацыі праекта. Генеральны дырэктар ААТ «Беларуськалій» Валерый Кірыенка расказаў, што ўклад прадпрыемства ў рэалізацыю праекта павінен скласці 50 працэнтаў, другую палавіну плануецца прыцягнуць ад суінвестара.

Разам з тым у ходзе абмеркавання гэтага пытання Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што калі «Беларуськалій» можа ажыццявіць праект толькі за кошт сваіх сродкаў, то няма сэнсу прыцягваць інвестара збоку і аддаваць яму палавіну будучага прадпрыемства. Валерый Кірыенка сказаў, што гэта можна зрабіць за кошт крэдытных рэсурсаў. «Аб гэтым і размова. Таму што суінвестар, які прыйдзе, свае грошы з кішэні не дастане. Ён таксама возьме крэдыт, і гэта будзе тая ж нагрузка на Петрыкаў. Дык няхай лепш гэта радовішча будзе ў дзяржаўных руках», — сказаў Прэзідэнт.

Згодна з указам №37 «Аб распрацоўцы Петрыкаўскага радовішча калійных солей», у мэтах пашырэння вытворчасці калійных угнаенняў у 2012—2021 гадах будзе рэалізаваны інвестыцыйны праект па прамысловай распрацоўцы Петрыкаўскага радовішча калійных солей з будаўніцтвам і ўводам у эксплуатацыю ў Гомельскай вобласці горна-абагачальнага комплексу магутнасцю не менш як 1,5 млн т хларыду калію ў год.

На падставе вынікаў правядзенага конкурсу па выбары інвестара рэалізацыя названага інвестпраекта будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з заключаным у трохмесячны тэрмін пасля падпісання ўказа інвестыцыйным дагаворам паміж Рэспублікай Беларусь і ААТ «Беларуськалій».

Нетры для распрацоўкі Петрыкаўскага радовішча калійных солей прадастаўляюцца тэрмінам на 50 гадоў на платнай аснове. На працягу дванаццаці месяцаў з дня заключэння інвестыцыйнага дагавора ААТ «Беларуськалій» належыць выплаціць у бюджэт разавы плацеж за права карыстання нетрамі, а таксама кампенсаваць панесеныя дзяржавай затраты на правядзенне геолагаразведачных работ у памеры $146,5 млн і $20,7 млн адпаведна.

Пры рэалізацыі інвестыцыйнага праекта ААТ «Беларуськалій» створыць адкрытае акцыянернае таварыства з далейшай перадачай дзяржаве 50 працэнтаў яго акцый.

Аляксандр Лукашэнка наведаў таксама ўчора Рэспубліканскую бальніцу спелеалячэння ў Салігорску.

Бальніца нараўне з традыцыйнымі метадамі лячэння на працягу 22 гадоў ажыццяўляе спецыялізаванае курсавое лячэнне пацыентаў з хваробамі органаў дыхання метадам спелеатэрапіі. Пацыенты праходзяць лячэнне ў спелеалячэбніцы, размешчанай на глыбіні 420 м у масіве каменнай солі і калійзмяшчальным пласце на базе калійнага рудніка першага рудаўпраўлення ААТ «Беларуськалій». Пасля рэканструкцыі лячэнне тут могуць праходзіць да 120 чалавек. У лячэбніцы заўсёды стабільны мікраклімат, аптымальны аэразольны, газавы і іонны састаў паветра, што з'яўляецца вядучым лячэбным фактарам. Акрамя падземнага аддзялення ў бальніцы ёсць наземны корпус. Аляксандр Лукашэнка павінен быў наведаць новы спальны корпус, уведзены нядаўна. Аднак кіраўнік дзяржавы выказаў жаданне спусціцца ў спелеалячэбніцу і азнаёміцца з тым, як арганізавана лячэнне.

Спусціўшыся ў падземнае аддзяленне, Прэзідэнт агледзеў палаты, дзе праходзяць лячэнне пацыенты як у дзённы, так і ў начны час. Тут жа размешчаны спартыўныя залы з магчымасцю займацца валейболам, тэнісам. Кіраўнік дзяржавы лічыць, што колькасць месц для спелеалячэння можна павялічыць. «Тут можна ўшчыльняцца. Магчымасці для гэтага ёсць. Напрыклад, для дзяцей можна ўстанавіць двух'ярусныя ложкі», — сказаў Прэзідэнт. «Трэба існуючыя плошчы выкарыстоўваць па максімуму. Падыдзіце да вырашэння пытання па-гаспадарску», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што паслугі бальніцы запатрабаваны не толькі сярод беларусаў, але і жыхароў замежжа. Ён лічыць, што тут ёсць магчымасці для павелічэння экспарту медыцынскіх паслуг. «Цяпер можна на гэтым зарабляць грошы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён даручыў уважліва вывучыць гэта пытанне.

За ўвесь перыяд дзейнасці бальніцы лячэнне тут прайшлі больш за 32 тыс. чалавек з Беларусі і іншых дзяржаў: Казахстана, краін Балтыі, Расіі, Украіны і іншых. Штогод тут лечыцца амаль 2 тыс. пацыентаў, з іх 20 працэнтаў складаюць дзеці 10-17 гадоў.

Эфектыўнасць спелеатэрапіі вельмі высокая і ва ўмовах стацыянара пры праходжанні поўнага курса лячэння дасягае 97 працэнтаў. Паводле ацэнкі, у спелеалячэнні маюць патрэбу прыкладна 37 тыс. жыхароў Беларусі, у тым ліку амаль 10 тыс. дзяцей. Высокая тэрапеўтычная і эканамічная эфектыўнасць метаду спелеатэрапіі абумоўлівае ў насельніцтва вялікі попыт на аказанне гэтага віду паслуг. Аляксандр Лукашэнка паразмаўляў з пацыентамі, якія праходзяць лячэнне ў бальніцы. Як расказалі кіраўніку дзяржавы, пасля праходжання поўнага курса лячэння на працягу года адзначаецца добрае самаадчуванне. Прэзідэнт лічыць, што калі ёсць добры вынік такога лячэння, неабходна пашыраць бальніцу. «Калі ёсць эфект, будзем пашыраць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

**Кар. БЕЛТА.**

## АБЗАЦ

**◢ Сёлета ў Беларусі вытворчасць каштоўных парод рыбы (ласасёвых, асятровых, сомавых) у параўнанні з папярэднім годам плануецца павялічыць практычна ўтрая — да 350 тон.**

◢ У Стаўбцоўскім раёне мінчанін не справіўся з кіраваннем, у выніку чаго яго аўтамашына «Аўдзі» перакулілася. Кіроўца сышоў з месца аварыі, пакінуўшы мёртвага пасажыра. На думку спецыялістаў службы бяспекі руху, не апошнюю ролю ў цяжкасці наступстваў ДТЗ адыграла небяспечная хуткасць. У выніку аварыі 22-гадовы пасажыр ад атрыманых цялесных пашкоджанняў памёр на месцы ДТЗ. Па звестках ДАІ, абодва ўдзельнікі здарэння — жыхары Мінска, нідзе афіцыйна не працавалі.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

**◢ Французскія фермеры пояць кароў добрым віном: штодзень рагулям належыць выпіваць па 2 бутэлькі. Як сцвярджаюць жывёлаводы, спажыванне віна прыводзіць да паляпшэння характару кароў, а таксама да павышэння якасці іх мяса. Пачатак эксперыменту паклаў фермер з поўдню краіны Жан-Карл Таставі, які для пачатку падпойваў трох сваіх кароў. На працягу чатырох месяцаў ён падмешваў віно да ячменю, сена і вінаграду. Каровы сталі больш рахманымі, а іх мяса — надзвычай смачным. У меню яно так і называецца — вінаялавічына. Мяса карыстаецца попытам у гурманаў у лепшых французскіх рэстаранах, хоць кошт яго немаленькі. Эксперымент працягваецца: зараз ідуць пошукі гатунку віна, ад якога ў мяса будзе асабліва прыемны і адметны смак.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## КРЫМІНАЛЬНУЮ СПРАВУ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ПЕРШАГА НАМЕСНІКА СТАРШЫНІ МІНГАРВЫКАНКАМА РАССЛЕДУЕ СЛЕДЧЫ КАМІТЭТ

**Расследаваннем крымінальнай справы ў дачыненні да першага намесніка старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Ігара Васільева займаецца Следчы камітэт. Пра гэта паведамілі ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Следчага камітэта Беларусі.**

Следствам прад'яўлена абвінавачанне па ч. 3 арт. 430 (атрыманне хабару асобай, якая займае адказную пасаду, у асабліва буйным памеры) КК Беларусі. Праводзіцца расследаванне. «Ігар Васільеў быў затрыманы 6 ліпеня супрацоўнікамі КДБ пры атрыманні хабару ў асабліва буйным памеры за спрыяльнае вырашэнне пытанняў, што ўваходзяць у яго кампетэнцыю», — расказалі ў Следчым камітэце. Пасля затрымання ён быў змешчаны пад варту.

**БЕЛТА.**

# РАЗВЕДКА ДЫЯЛОГАМ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

На сустрэчы таксама прысутнічалі ... 

Нягледзячы на тое, што прысутныя ...

У тым, **старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Васіль БАЙКОЎ** у вітальным слове, на якім журналісты яшчэ прысутнічалі, заўважыў, што па шматгадовай традыцыі місію БДІПЧ АБСЕ запрасілі ў якасці назіральніка за парламенцкімі выбарамі ў Беларусі адну з першых.

— Хачу падкрэсліць, што беларускі бок прыкладзе максімум намаганняў, каб выбары прайшлі згодна з заканадаўствам і міжнароднымі стандартамі, якія склаліся на сёння, — запэўніў суразмоўцаў Васіль Байкоў.

У перамовах таксама ўдзельнічалі дэпутаты парламента, якія прадстаўляюць партыі і грамадскія арганізацыі, — Аляксандр ЗАЗУЛЯ (Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане), Міхаіл ОРДА («Белая Русь»), Валянціна ЛЯВОНЕНКА (КПБ), Міхаіл РУСЫ (Аграрная партыя Беларусі).

— Гэтая місія — тэхнічная, яе задача — прааналізаваць сітуацыю, каб на працягу 10 дзён падрыхтаваць даведку для кіраўніцтва АБСЕ, якое і прыме рашэнне пра колькасць назіральнікаў, час і тэрміны назірання за выбарамі, — патлумачыў пасля перамоў старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце. — Больш за ўсё іх цікавіла, як палітычныя партыі прадстаўлены ў акруговых камісіях. Яны задавалі канкрэтныя пытанні і былі здзіўлены, што прадстаўніцтва партый у акруговых камісіях залежыць ад колькасці членаў гэтых партый і трэба ўлічваць, што пазней будуць фарміравацца ўчастковыя выбарчыя камісіі, дзе таксама будуць прадстаўлены партыі.

З 15 зарэгістраваных у Беларусі партый тры маюць сваіх прадстаўнікоў у акруговых выбарчых камісіях, нагадаў Васіль Байкоў. Дэпутаты таксама імкнуліся запэўніць прадстаўнікоў БДІПЧ, што дэмакратычнасць мажарытарнай сістэмы выбараў вышэй, чым партыйнай.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# У першым паўгоддзі пабудавана амаль 2,5 млн $м^2$ жылля

**Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, за першыя 6 месяцаў гэтага года на будаўніцтва жылля выкарыстана 10,2 трлн рублёў інвестыцый у асноўны капітал, што адпавядае 64,8 працэнта да І паўгоддзя летась. Усяго сёлета арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 30,7 тысячы новых кватэр. Уведзена ў эксплуатацыю 2 млн 469,1 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, што складае 58,8 працэнта да гадавога задання.**

За першае паўгоддзе ўведзена ў эксплуатацыю 1 млн 430,6 тысячы квадратных метраў жылля для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Паводле інфармацыі Нацстата, сёлета для жыллёвых чаргавікоў з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі пабудавана 1 млн 312,9 тысячы квадратных метраў жылля, або 56,8 працэнта ад гадавога задання.

Больш за ўсё жылля ў першым паўгоддзі было пабудавана ў Мінскай вобласці (534,3 тыс. кв. м), на другім месцы Мінск (477,4 тыс. кв. м), потым ідзе Брэсцкая вобласць (447,5 тыс. кв. м), Гомельская (318 тыс. кв. м), Гродзенская (298,3 тыс. кв. м), Віцебская (203,1 тыс. кв. м) і Магілёўская вобласць (190,2 тыс. кв. м). Галоўнымі крыніцамі фінансавання жыллёва будаўніцтва з'яўляюцца ўласныя сродкі насельніцтва (47,2 працэнта інвестыцый) і крэдыты банкаў (35,3 працэнта).

**Сяргей КУРКАЧ.**

# У НЯБЁСАХ І НА ЗЯМЛІ

## Вішоў ушанаваў Пятра і Паўла, а таксама сваіх працаўнікоў

**12 ліпеня ў калгасе «Радзіма», што ў Бялыніцкім раёне, быў аб'яўлены выхадны дзень. Традыцыйна ў аграгарадку Вішоў у дзень апосталаў Пятра і Паўла спалучаюць духоўнае і свецкае.**



Раніцай свята пачынаецца каля царквы, пабудаванай у гонар Пятра і Паўла. Па дарожцы ў кветках прайшоў да вернікаў **архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Сафроній**, хрэсны ход і ўрачыстае богаслужэнне сабралі шмат народу.

На лавах сельскага амфітэатра размясціліся прадстаўнікі ўсіх вёсак, якія ўваходзяць у склад гаспадаркі. Кіраўніцтва «Радзімы» ўшанавала лепшых працаўнікоў і заслужаных ветэранаў працы.

Людзей парадавалі не проста добрым канцэртам, а беларускамоўнай пастаноўкай. Там былі і смешныя, і вельмі кранальныя моманты. Насмяшыў аўкцыён па продажы жывога і вельмі жвавага парсючка, які скончыўся набыццём яго за 110(!) рублёў элегантнай жанчынай. А вось старыя фотаздымкі, асабліва даваеннага часу, якія дэманстраваліся на вялікім лічбавым экране, выклікалі шчымлівае замілаванне.

Імкненне мець усё сваё і рабіць усё самім — гэта адметнасць «Радзімы». Такі добры тон зададзены **кіраўніком Аляксандрам Лапацентавым**: тут цяпер нават праваслаўная царква пабудавана і ўтрымліваецца на сродкі гаспадаркі!

На пасадзе старшыні Аляксандр Міхайлавіч працуе ўжо 32-і год, і паступова стварыў тут асаблівую сацыяльную мадэль, якая ўжо стала вядомай на ўсю краіну. Гэта тут плацяць надбаўкі да заробку тым, хто не парушае дысцыпліны і не курыць (цяпер не курыць аж 85%), хто ўдзельнічае ў мастацкай самадзейнасці і спартыўных мерапрыемствах, а таксама даюць грашовыя стыпендыі лепшым школьнікам і заахвочваюць дбайных бацькоў. А сярэдні заробак у «Радзіме» набліжаецца да 4 мільёнаў рублёў.

У гаспадарцы ствараюць такія ўмовы, што мясцовыя людзі не імкнуцца ў гарады за жураўлём у небе, а маюць сваю сельскую, адкормленую «сініцу» ў руках. Але за працу тут строга спаганяюць. Буйная вытворчасць не павінна даваць збою: калгас вырабляе да 40 тон малака і 4 тоны мяса за суткі. Можа, з гэтай прычыны нават у вялікае свята засталіся працаваць на мехдвары мужчыны, якія рыхтуюць магутныя камбайны да будучага жніва.

Разам з мясцовымі журналістамі, якія прыехалі на свята, кіраўнік «Радзімы», вельмі паважаны чалавек у Магілёўскай вобласці, абмяркоўваў праблему героя сённяшняга часу.

— Я думаю, што чалавек, які шчыра аддае душу, веды і кавалак здароўя людзям на сваім працоўным месцы, і ёсць герой, — сказаў Аляксандр Лапацентаў. — Калі б такіх людзей было больш, то і наша жыццё было прыгажэйшым.

**Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.**

*Бялыніцкі раён.*

# «УРОК БУДУЧЫНІ» АД ПАРКУ ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Каб быць на ўзроўні сучасных патрабаванняў, трэба ўжо сёння вучыць школьнікаў не толькі азам работы з камп'ютарам, але і авалоданню з яго дапамогай першаснымі навыкамі інфармацыйных тэхналогій. А каму і дзе вучыць гэтаму? Зразумела, у нашых школах. І тут вельмі многае залежыць ад узроўню кадраў настаўнікаў, іх падрыхтоўкі і своечасовай перападрыхтоўкі ў адпаведнасці з новымі патрабаваннямі. Адсюль і галоўная мэта эксперыментальнага праекта — стымуляванне творчай актыўнасці педагогаў па ўкараненні мадэлі навучання «1 вучань — 1 камп'ютар».

Эксперымент праводзіўся ў розных гарадах краіны — у прыватнасці, у наваполацкай гімназіі № 1, у мінскай гімназіі № 30 і інш. Школы, якія ўдзельнічалі ў ім, атрымалі статус так званых эксперыментальных пляцовак, там былі вызначаны кантрольныя і эксперыментальныя класы. У школах мабільны камп'ютарны клас ствараўся на базе звычайнага вучэбнага кабінета, а таму спатрэбілася яго дадаткова пераабсталяваць: забяспечыць месцы для захоўвання нэтбукаў, даць магчымасць адначасова зараджаць усе машыны ад электрычнай сеткі, усталяваць і наладзіць абсталяванне для работы па бесправадной сетцы, правесці дадатковыя крыніцы сілкавання і г. д. У эксперыментальных класах было створана асяроддзе электроннага навучання, прадастаўлена адпаведнае праграмнае забеспячэнне, былі выдзелены персанальныя камп'ютары для настаўніка і кожнага вучня эксперыментальнага класа. Усе нэтбукі, камп'ютары мелі доступ да інтэрнэту па Wi-Fi і аб'ядноўваліся ў лакальную сетку.

Важная дэталь: настаўнікі, якія ўдзельнічалі ў праекце, адначасова сталі таксама і актыўнымі ўдзельнікамі сеткавай супольнасці «Адукацыйная галактыка». Яны абменьваюцца досведам з калегамі з краін СНД (пераважна Расіі, Украіны і Казахстана) па рэалізацыі мадэлі навучання «1 вучань — 1 камп'ютар».

Якія відавочныя плюсы выкарыстання гэтай мадэлі? Як вынікае са справаздачы, падчас эксперыменту змянілася ў лепшы бок якасць адукацыйнага працэсу. Новы падыход спрыяў яго інтэнсіфікацыі, фарміраванню глыбокіх ведаў у вучняў, выпрацоўцы ў іх пэўных уменняў і навыкаў. Спецыялісты заўважылі, што павышэнне эфектыўнасці навучання было дасягнута за кошт індывідуальнага падыходу да школьнікаў, узнікнення ў іх дадатковай матывацыі авалодваць ведамі. Новы падыход дазволіў больш эфектыўна весці навучальны працэс, рацыянальна выкарыстоўваць час заняткаў, аператыўна адсочваць вынікі навучання, прымаць абгрунтаваныя і мэтазгодныя меры па павышэнні яго ўзроўню.

Настаўнікі заўважылі пэўныя змены ў сваіх вучняў: зацікаўленасць у вучобе, пазітыўнае стаўленне да камп'ютара як сродку атрымання новых ведаў, рост узроўню развіцця разумовых аперацый, набыццё ўменняў валодання прыёмамі самакантролю, удасканаленне псіхічных працэсаў (успрымання, мыслення, увагі), пазнавальнай матывацыі, рэгуляцыі ўласнай дзейнасці і г.д. Была зафіксавана актывізацыя вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў праз атрыманне і практычнае ўжыванне інфармацыі, праверку атрыманых ведаў. Вучні пачатковай школы атрымалі магчымасць удзельнічаць у інтэрнэт-алімпіядах. І гэта ўсё на фоне зніжэння нагрузкі на школьнікаў. Разам з тым, адзначым, што апрабацыя новага падыходу выявіла шэраг праблем, якія перашкаджаюць сёння ўкараненню мадэлі ў масавую школьную практыку.

Узнікае пытанне: а як ацанілі ў школах вынікі праекта тыя, хто адказваў за яго рэалізацыю? З гэтай мэтай было праведзена анкетаванне сярод дырэктараў і намеснікаў дырэктараў школ. Апытаныя адзначылі наступныя станоўчыя змены, якія адбыліся ў вучэбнай установе і педагагічным калектыве пасля таго, як пачала ўкараняцца новая мадэль. У першую чаргу, узрасла матывацыя педагогаў і вучняў. Настаўнікі лічаць, што эксперымент станоўча паўплываў на іх развіццё як педагогаў і асоб, павысілася іх кваліфікацыя, пашырылася кампетэнтнасць. У прыватнасці, у адказе на пытанне «Што трэба зрабіць для таго, каб прадоўжыць развіццё мадэлі «1 вучань — 1 камп'ютар» у вашай навучальнай установе ў будучым?» былі выказаны наступныя слушныя заўвагі. Напрыклад, прадумаць працяг праграмы для базавай школы, павялічыць колькасць такіх класаў у пачатковай школе, мэтанакіравана ўмацоўваць матэрыяльную базу школ, набыць мабільны камп'ютарны клас. А магчыма, распачаць набыццё нэтбукаў за кошт бацькоў, Многія настаўнікі, якія не былі ўцягнуты ў эксперымент, заявілі аб жаданні таксама выкарыстоўваць нэтбукі на сваіх уроках.

Прадстаўнікі школ таксама адзначылі цікавасць бацькоў да новай мадэлі навучання.

Дарэчы, аб бацьках. Яны, напэўна, якраз і былі самымі ўважлівымі і строгімі назіральнікамі за ходам рэалізацыі праекта, часам выказвалі слушныя заўвагі і меркаванні. У цэлым бацькі падтрымалі праект. Яны яшчэ ў пачатку эксперыменту выказалі надзею, што іх дзецям будзе цікавей вучыцца па новым метадзе, што ўдзел у праекце павысіць узровень іх камп'ютарнай адукаванасці. Па меркаванні бацькоў, сёння трэба пашырыць лік праграм для выкарыстання нэтбукаў у самастойнай працы над вучэбным матэрыялам, прадоўжыць выкарыстанне мадэлі «1 вучань — 1 камп'ютар» у сярэдняй школе. Ёсць нават прапановы прадставіць магчымасць частку хатніх заданняў выконваць (спачатку ў якасці эксперыменту) у электронным варыянце з дасылкай выкладчыку.

Большасць бацькоў падтрымлівае ідэю ўкаранення мадэлі навучання з выкарыстаннем камп'ютараў. Аднак ёсць бацькі, якія выказваюць сумненні ў неабходнасці поўнага пераходу на навучанне па-новаму. Яны лічаць, што бацькам мэтазгодна мець альтэрнатыву, каб была магчымасць выбіраць: вучыцца іх сыну ці дачцэ ў электронным класе з нэтбукам альбо ў звычайным класе. Асноўныя асцярогі бацькоў былі звязаны з магчымым пагаршэннем здароўя дзяцей — у першую чаргу, зніжэннем вастрыні зроку. Бацькі таксама выказвалі асцярогі, што пасля электронных класаў дзецям не будзе чаго вывучаць на ўроках інфарматыкі.

Таму, згодна са справаздачай, было вырашана сістэматызаваць вынікі эксперыменту, падрыхтаваць інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы аб мэтазгоднасці выкарыстання індывідуальных электронных сродкаў навучання ў адукацыйным працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, абагульніць іх у выніковай справаздачы.

**Падрыхтаваў Леанід ТУГАРЫН.**

# АЙЧЫННАЕ ВІНО ПАВОЛЬНА ЗАГІНЕ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А для гэтага яно павінна быць не проста смачным, якасным, натуральным — гэта мы, дзякуй Богу, рабіць умеем і рабіць будзем, — але і знешне адпавядаць тэндэнцыям XXI стагоддзя. Па вялікім рахунку, істотныя крокі ў гэтым накірунку зроблены. Цяпер бутэльку ягаднага віна гэтак жа не сорамна паставіць на стол, як і бутэльку вінаграднага. Іншая рэч... пераканаць у гэтым патэнцыйнага спажыўца. І тут патрабуецца заняцца тым, што пакуль не з'яўляецца моцным бокам амаль усіх тутэйшых вытворцаў — стварэннем брэнда і прасоўваннем тавару на айчынны і замежны рынкі.

Мала таго, што прасоўванне ў гэтым выпадку ў прынцыпе справа цяжкая, дык сітуацыю ўскладніла адна акалічнасць. У шэрагу рэгіёнаў летась прымаліся рашэнні па абмежаванні продажу пладова-ягаднага віна. Захад быў выкліканы спробай знізіць у правінцыі татальную алкагалізацыю насельніцтва, дзе «пладова-выгаднае», як яго называюць у народзе, — самае даступнае па кошце пры гарантаванай якасці. На першы погляд, рашэнне нібыта правільнае... Мужыкі павінны будуць падчас сельгасработ менш піць, у кіраўніцтва будзе менш непрыемных здарэнняў і г.д. Праўда, чуткі «з палёў» даносяць, што мужыкі з тых мясцін, дзе «забаронена», наведваюцца туды, дзе «дазволена»... Яно ж і зразумела: хто віно піў, той яго піць будзе, а значыць, абавязкова знойдзе (хоць бы гэта быў і расійскі «кансервант»). Чуткі чуткамі, але ж і праўда. Дакладных звестак аб тым, што выдаленне «чарнілаў» з паліц магазінаў прывядзе да цвярозасці і спрафілактуе цесна звязаныя са злоўжываннем алкаголю нешчаслівыя здарэнні і падрыў здароўя, пакуль няма. Паралельна ж узнікае і іншае пытанне. Што будзе з вытворцамі прадукцыі? Апошнія забілі трывогу, паколькі страчваюць у рэалізацыі істотныя аб'ёмы. Між тым ніхто яшчэ не паказаў/не патлумачыў, ЧАМУ віно нельга, а што-небудзь памацней можна? Ва ўсякім выпадку, аб'ёмы рэалізацыі лікёра-гарэлачнай прадукцыі ўстойліва растуць. Паводле афіцыйных звестак, аб'ёмы лікёра-гарэлачнай прадукцыі прырaслі за 5 гадоў амаль у 2 разы, а ў вінаробстве ў параўнанні з 2003 годам назіраецца падзенне аб'ёмаў на 40 працэнтаў.

**У сваіх артыкулах я не раз выступала за любыя абмежаванні даступнасці алкаголю ў нашай краіне. Аднак у гэтым выпадку — з пладова-ягаднымі натуральнымі сталовымі вінамі — не ўсё, як высвятляецца, так адназначна.** Паспешлівыя меры з тым жа абмежаваннем у гандлёвых пунктах могуць прывесці ў рэшце рэшт да нечаканага адмоўнага выніку — гібелі віннай галіны ў краіне. Адначасова, як было сказана вышэй, узнікаюць заканамерныя сумненні наконт таго, што асноўныя спажыўцы «пладова-выгаднага» стануць на шлях цвярозасці, а не пачнуць шукаць сумнеўную альтэрнатыву.

Між тым, вінная галіна ў краіне спрабуе зараз узняцца з кален і пачынае выпуск пладова-ягаднага новага ўзроўню. Чаму б і не? Пладовае вінаробства вельмі развітае ў многіх краінах, напрыклад, у Фінляндыі. Справа гэтая там знаходзіцца ў прыватных руках. Тамтэйшыя вінаробы каштавалі, дарэчы, беларускую прадукцыю і прызналі, што яна мае права на жыццё.

Каб разабрацца ў тым, што фіны знайшлі ў нашай «пладоўцы», і давялося адправіцца на дэгустацыйную экскурсію ў Віцебскую вобласць, на Талачынскі кансервавы. Адразу скажу, што больш за ўсё мне спадабалася віно з чырвонай парэчкі, натуральнае, без дабаўлення спірту. Хоць прадэгуставаць давялося... агрэставае, малінавае, чорнапарэчкавае, журавіннае (журавіны — 70%, 20 — яблыкі і 10 — чарніцы), віно спецыяльнай тэхналогіі «Мадэрная асалода»... Як вядома, натуральныя ягады — лепшыя фарбавальнікі. Асабліва чарніцы, аронія чарнаплодная, тая ж чорная парэчка, так што ва ўсім пералічаным няма штучных фарбавальнікаў, араматызатараў і г.д...

«Мы распрацоўвалі рэцэптуру для беларускага віна так, каб там не было ніякіх штучных дабавак, за выключэннем хіба антыакісляльніка, — кажа **намеснік начальніка аддзела лікёра-гарэлачнай, вінаробчай і півабезалкагольнай прадукцыі Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні Карынэ АЛЕКСАНЯН**. — Варта дадаць, што да 2006 года ў краіне існаваў адзін стандарт — віно пладова-ягаднае. Мы ж зрабілі з гэтага стандарту тры напрамкі. Першы — віно пладова-ягаднае натуральнае, у якім аб'ёмная доля натуральнага спірту складае 9-14 працэнтаў. Збожжавы спірт сюды не дадаецца, а выпрацоўваецца ў выніку браджэння, якое адбываецца за кошт нязначнага дабаўлення цукру. Другі напрамак — віно пладовае мацаванае, якое, у сваю чаргу, бывае ардынарным і палепшаным. Ардынарнае віно атрымліваецца шляхам натуральнага браджэння з аб'ёмнай доляй этылавага спірту не менш як 5 працэнтаў, пасля чаго ідзе дамацаванне этылавым спіртам з харчовай сыравіны да 16-18 працэнтаў. У палепшаным натуральнае браджэнне складае не менш за 10 працэнтаў. Нарэшце, віно спецтэхналогіі, калі да вінаматэрыялаў прымяняюцца спецыяльныя тэхналагічныя прыёмы, якія дазваляюць мадэляваць працэс нібыта выцяжкі ў дубовай бочцы, — дадаюцца прэпараты драўніны дуба і вытрымліваецца адпаведны рэжым цеплавой апрацоўкі. Атрымліваецца, нібыта віно пабывала ў дубовай бочцы. Такое віно практычна ідэнтычнае мадэры, партвейну, якія выпрацоўваюць у паўднёвых краінах... Не так даўно Талачынскі кансервавы пачаў выпуск першай эксперыментальнай партыі пладовага марачнага віна...».

— Нядаўна нам казалі: бутэлька — ніякая, этыкетка — ніякая, і корак-«нахлабучка». Хіба можна ставіць на прылавак, побач з вінаградным віном, такі тавар? — разважае **дырэктар РУП «Талачынскі кансервавы завод» Анатоль АНЮХОЎСКІ**. — На сёння вінаробства дасягнула высокіх стандартаў якасці. Акрамя тэхнічнага пераўзбраення, якое закранула прадпрыемства, развіваецца і ўласная сыравінная база. У нас 550 га плошчы саду, дзе растуць парэчка чорная і чырвоная, агрэст, маліна, аронія чарнаплодная, яблыкі, грушы, алыча, буякі...

Паверце, мы ўмеем вырабляць! На жаль, не ўмеем пакуль ствараць брэнд і прадаваць... Завод выпускае 40 найменняў віна, за якое сапраўды не сорамна, але мала хто пра гэта ведае нават сярод саміх беларусаў. І калі сёння мы бачым падзенне аб'ёмаў продажу нашага віна, то задаём сабе пытанне: хіба ў цэлым пры гэтым краіна пачала менш выпіваць? Не. Значыць, магчыма, мы аддаём свой рынак для рэалізацыі той прадукцыі, якая завозіцца... Я магу сказаць адназначна: калі зараз мы страцім айчыннае вінаробства, то страцім яго, паверце, назаўсёды. Канкурэнцыя ў гэтай галіне вельмі сур'ёзная.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Ад усёй душы віншую маіх нявестак з в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна **АЗЁМШУ Алену Васільеўну** і **АЗЁМШУ Алену Аляксандраўну** з днём нараджэння.

Жадаю ўсяго самага лепшага: моцнага здароўя, дабрабыту, удачы і каб мае праўнучкі раслі і мацнелі.

**Ала Якаўлеўна.**

## ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

С 18 июля 2012 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 12.07.2012 №352 размер ставки рефинансирования установлен в размере 31,0 процента годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает о снижении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006 и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006 на 1 процентный пункт с 19.08.2012.

**Телефон Контакт-центра Банка – 136**

8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

**Извещение о проведении аукциона по продаже предприятия как имущественного комплекса (ЧУП «Бобруйский комбинат нетканых материалов» Белкоопсоюза)**

**Организатор аукциона:** Частное унитарное предприятие «Научно-производственный центр Белкоопсоюза» (далее по тексту — ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза»), г. Минск, пр-т Победителей, 17, 1001. Тел. (029) 318 37 22, (017) 226 91 19, (017) 226 99 22.

Аукцион проводится **17 августа 2012 г.** в 11 часов 00 минут по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 17 в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества организаций потребительской кооперации, собственником которого является Белкоопсоюз.

Сведения о предмете аукциона: предприятие как имущественный комплекс, с регистрационным номером 0001109, созданное на базе Частного производственного предприятия «Бобруйский комбинат нетканых материалов» Белкоопсоюза, расположенное по адресу 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Тимирязева, 5, путем продажи на аукционе с начальной ценой продажи без учета НДС: 7 000 000 000 (семь миллиардов) руб.

Предприятие расположено на земельных участках общей площадью 7,0259 га, расположенных по адресам 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Тимирязева, 5, пер. Тимирязева, 4 и ул. Бахарова, 269, предоставленные на праве постоянного пользования решениями Бобруйского городского исполнительного комитета от 27.05.1993 № 4802 и от 23.09.2008 № 19-8.

**Условие продажи:** с условием реализации бизнес-плана инвестиционного проекта «Реконструкция и техническое переоснащение производства нетканых материалов на ЧУП «Бобруйский комбинат нетканых материалов» Белкоопсоюза».

Объект торгов обременен договорами аренды.

Срок и условия оплаты: определяются по согласованию победителя торгов с собственником имущества при заключении договора купли-продажи.

**Задаток:** 700 000 000 (семьсот миллионов) руб.

Задаток перечисляется ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза», р/с 3015201080017, УНН 100060419, ОКПО 14586268, ф-л МГД ОАО «Белагропромбанк» г. Минска, код 963.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 17, каб. 1004а, 1001, с 8.30 до 12.30 и с 13.30 до 17.30 в рабочие дни. Прием документов заканчивается в 17 часов 30 минут 15 августа 2012 г.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в Извещении;

индивидуальными предпринимателями — резидентами Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии;

юридическими лицами — резидентами Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, копия устава (учредительного договора — для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии;

индивидуальными предпринимателями — нерезидентами Республики Беларусь — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

| Инженерная инфраструктура | В стадии проектирования | В стадии проектирования | В стадии проектирования | В стадии проектирования | Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газ, водопровод, канализация, теплосети с условиями | Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, тепловые сети, газ, водопровод, канализация с условиями |
| Экологическое состояние | Благоприятное | Благоприятное | Благоприятное | Благоприятное | Благоприятное | Благоприятное |
| Наименование ограничений в праве | НЕТ | НЕТ | НЕТ | НЕТ | Ограничение права в пользовании частью земельного участка площадью 0,0450 га в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадью 0,0704 га в охранных зонах линий электропередачи, площадью 0,1252 га в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадью 0,2052 га в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадью 0,0721 га в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения | Ограничение права в пользовании частью земельного участка площадью 0,0087 га в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадью 0,0010 га в охранных зонах сетей и сооружений газоснабжения, площадью 0,1202 га в охранных зонах сетей и сооружений канализации |
| Начальная цена земельного участка, руб. | 42 338 715 | 35 910 700 | 43 954 697 | 43 990 608 | 327 295 234 | 161 282 074 |
| Задаток, руб. | 4 233 870 | 3 591 070 | 4 395 470 | 4 399 060 | 32 729 520 | 16 108 210 |
| Дополнительное условие | Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: - за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 2 430 745 рублей, - за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 320 000 | Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: - за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 2 430 745 рублей, - за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 320 000 | Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: - за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 2 430 745 рублей, - за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 320 000 | Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: - за формирование земельного участка и установление границ на местности в сумме 2 430 745 рублей, - за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 320 000 | Возместить затраты: - за проектно-изыскательские работы по формированию земельного участка на право заключения договора аренды в сумме 4 029 023; - за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него в сумме 420 000 рублей | Возместить затраты: - по ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку в сумме 469 452 рубля |

Условия проведения аукциона в части продажи земельных участков в частную собственность.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения, формированием земельного участка, государственной регистрацией создания земельного участка;

осуществить в двухмесячный срок государственную регистрацию прав, ограничений прав на земельный участок;

получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;

приступить к занятию земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на него.

К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявление в соответствии с действующим законодательством.

Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь.

Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 5%.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;

копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или доверенного лица;

доверенность, заверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физ. лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Условия проведения аукциона в части продажи права аренды земельных участков.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

заключить с Лидским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав, ограничений прав на земельный участок;

получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта;

завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией;

за нарушение сроков строительства взимается пеня в размере из расчета 1/2 ставки рефинансирования Национального банка (годовых) от стоимости строительства за каждый день просрочки.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, физические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копии учредительных документов;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе).

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Номер р/с для перечисления задатка для участия в аукционе по продаже змельных участков в частную собственность и по продаже права аренды земельных участков – р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.

# ЗАО «ДЕЛЬТА БАНК»

220036, г. Минск, ул. Розы Люксембург, 95. Тел. 279 0 279,
www.deltabank.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2012 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2012 | 01.07.2011 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 114 996,4 | 52 800,5 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 201 829,0 | 67 291,1 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 235 865,1 | 98 798,5 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 47 132,7 | 30 934,2 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 559 943,2 | 213 428,6 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 45 157,8 | 19 962,0 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 1 155,6 | 873,6 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 19 586,5 | 11 627,1 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 23 184,5 | 10 289,7 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 1 248 850,8 | 506 005,3 |
| **14** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 32 042,1 | 34 610,7 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 106 218,3 | 26 739,6 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 853 584,9 | 311 253,9 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 99 032,3 | 10 043,3 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 7 005,0 | 2 686,1 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 7 798,4 | 11 748,5 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1 105 681,0 | 397 082,1 |
| **22** | **КАПИТАЛ** | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 108 500,0 | 72 200,0 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 3 610,0 | 3 610,0 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 12 316,6 | 2 001,7 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 18 743,2 | 31 111,5 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 143 169,8 | 108 923,2 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 1 248 850,8 | 506 005,3 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2012 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2012 | 01.07.2011 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 54 072,5 | 13 750,7 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 126 219,0 | 16 590,4 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | (72 146,5) | (2 839,7) |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 115 600,3 | 39 429,4 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 4 376,8 | 2 411,2 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 111 223,5 | 37 018,2 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 83,3 | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 14 543,5 | 5 327,5 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (14 383,6) | 20 521,7 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (13 353,2) | 1 741,6 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 8 394,9 | 3 820,6 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 52 478,1 | 20 857,6 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 4 747,5 | 1 541,9 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 3 842,7 | 39 707,2 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | - | 8 773,7 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 3 842,7 | 30 933,5 |

**И.о. Председателя Правления** **Кудашкина Л.А.**

**И.о. Главного бухгалтера** **Запольская С.С.**

**Дата подписания «13» июля 2012 г.**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 27 от 01.09.2007 г. УНП 807000015.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Информация о застройщике**

Общество с ограниченной ответственностью «Жилстройкомплект», находящееся по адресу: 220004, г. Минск, ул. Сухая, 4, каб. 14, 21В, тел.: 289 19 56, 8(029) 110 14 55.

Режим работы: понедельник–пятница с $9^{00}$ до $18^{00}$, обед с $13^{00}$ до $14^{00}$, выходные дни – суббота, воскресенье, государственные праздники и праздничные дни.

Зарегистрировано Минским горисполкомом, решение от 17 января 2011 года, в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 290017687.

**Информация о проекте строительства**

Цель проекта – строительство объекта «Многоквартирные жилые дома № 1, № 2 (по генплану) со встроенными помещениями торгово-административного назначения и автостоянками в границах пр. Дзержинского, ул. Хмелевского с выделением первой очереди – «Многоквартирный жилой дом № 1 (по генплану) со встроенными помещениями торгово-административного назначения и автостоянкой» в г. Минске.

Начало строительства – март 2012 года.

**Объект долевого строительства**

Проектируемая территория общей площадью 1,35626 га для проектирования жилых домов № 1, № 2, по ГП расположена в Московском районе г. Минска и ограничена: с юго-востока – главной радиальной осью города Брестского направления пр. Дзержинского; с северо-востока – ул. Хмелевского; с юго-запада и северо-запада – реконструируемым кварталом существующей многоэтажной застройки.

Первая очередь строительства – Секции № 1 и № 2 жилого дома № 1(по генплану) имеют этажность 20 и 23 этажей соответственно. На первом этаже расположены помещения торговли с высотой этажа 4,2 м, на втором этаже – административные (офисные) помещения площадью от 13,9 $м^2$ до 67,5 $м^2$ с высотой этажа 3 м; выше расположены жилые этажи. Предусмотрены отдельные входы в помещения торгово-административного назначения. Общая площадь торговых помещений 1-й секции – 370,8 $м^2$, 2-й секции – 352,3 $м^2$. Общая площадь офисных помещений 1-й секции – 422,7 $м^2$, 2-й секции – 402,1 $м^2$.

Здание запроектировано монолитное, с заполнением, ограждающих периметров наружными газосиликатными блоками, внутренние перегородки из газосиликатных блоков, внутренние стены лестничных клеток из монолитного железобетона. Фундаменты запроектированы монолитными. Кровля секций запроектирована плоская по монолитному перекрытию с внутренним водоотводом.

Внутренняя отделка помещений решается в зависимости от функционального назначения помещений на основе применения современных отделочных материалов.

Цена 1 $м^2$ общей площади на дату опубликования проектной декларации составляет: от 1 100 долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь.

**Застройщиком получены:**

Участок площадью 1.35626 га передан ООО «Жилстройкомплект» на основании решений Мингорисполкома № 1248 от 12.05.2001, № 3462 от 24.11.2011, № 3056/1 от 19.10.2011 г. «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении на строительство».

Свидетельств (удостоверений) о государственной регистрации создания земельных участков и возникновения прав на них (от 31 мая 2011 г. №№ 500/718-11363, 500/718-11364).

Экспертное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 04.06.2012 № 347-15/12И.

Договор строительного подряда от 01.03.2012 г. № 3.

Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию – декабрь 2013 г.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходом работ по его строительству можно получить по адресу: г. Минск, ул. Сухая, 4, каб. 21В или по телефонам 289 19 56; Velcom (029) 110 14 55.

*Генеральный директор В. Н. Дорофейчук*

# РУЧНІКІ ПАПЛЫЛІ Ў ВЕЧНАСЦЬ



**Літаратурны крытык Варлен БЕЧЫК, народны паэт Беларусі Аркадзь КУЛЯШОЎ і Вера ВЯРБА.**

Замаркоціўся Янка, заплакала Алёна і, нізка апусціўшы галаў, «супыніўся гнеды пад вярбой густой». Калі вы памятаеце, гэта ўсё мастацкія вобразы з вельмі папулярнай у 60-я гады мінулага стагоддзя песні «Ручнікі», якая, аднойчы прагучаўшы па радыё, хутка стала народнай. На аднайменны верш тады яшчэ маладога аўтара Веры Вярбы светлую, жыццесцвярджальную музыку напісаў самадзейны кампазітар М. Пятрэнка, і яна на імклівых радыёхвалях увайшла ў кожны дом і хату, улілася ў душу кожнага беларуса. Але кажучы пра Янку і Алёну, сёння журыцца гарачы шчодры ліпень, смуткуе ўся літаратурная Беларусь. Не стала славутай беларускай паэткі Веры Вярбы, якая з першых сваіх твораў запомнілася ўслаўленнем маладосці, паэтызацыяй кахання, замілаваннем роднай прыродай. Нават і псеўданім яе адтуль — ад ціхаплынных беларускіх рачулак, ад купчастых, раскідзістых вербаў над ціхай вадой.

Сапраўднае ж імя Веры Вярбы — Сакалова Гертруда Пятроўна. Нарадзілася 14 студзеня 1942 года ў вёсцы Высокі Гарадзец Талачынскага раёна. Маці працавала інжынерам, бацька загінуў на фронце пад Смаленскам. Яна скончыла філалагічны факультэт БДУ, працаваць пачала ў Дзяржкамітэце па друку, была літсупрацоўнікам газеты «Літаратура і мастацтва», рэдактарам аддзела паэзіі і прозы часопіса «Беларусь». Першыя вершы надрукавала вельмі рана, у 1958 годзе, а калі маладой паэтэсе было толькі 20 гадоў, выдала і сваю першую кнігу «Вочы вясны». Якраз гэты зборнік і пацвердзіў прыроджаную таленавітасць аўтара, стаў сапраўдным набыткам беларускай паэзіі. Потым адна за адной з'яўляюцца і іншыя кнігі Веры Вярбы — «Белыя пісьмы», «Высакосны год», «Сіняя бухта», «Мая маленькая планета», томік выбранай паэзіі «Белыя пісьмы». Творы яе перакладаліся на рускую і многія іншыя еўрапейскія мовы, і сама яна плённа перакладала на сваю родную мову, напрыклад, аповесць Р. Фраермана «Дзікі сабака дынга, або Аповесць пра першае каханне». Пісала таксама вершы і казкі для дзяцей, выдала «дзіцячы» зборнік «Пралеска». З-за пагаршэння стану здароўя апошнія гады Вера Пятроўна ў друку выступала не часта, і сёння застаецца толькі шкадаваць, што таленавітай паэтэсе Бог адпусціў так мала — усяго семдзесят гадоў жыцця.

...Журыцца гарачы ліпень, смуткуюць Янка і Алёна. У беларускай вёсцы, бадай, няма хаты, дзе б не ведалі і не памяталі тую славутую калісьці песню. На жаль, заўчасна не стала яе аўтара — шаноўнай Веры Вярбы, але верыцца, што яшчэ доўга і далёка будуць плыць яе «Ручнікі», пушчаныя на ваду яе таленавітай рукой і палымяным шчодрым сэрцам.

**Віктар ГАРДЗЕЙ,**
**лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа.**

## Вера ВЯРБА

* * *

*Усё ў жыцці здаецца проста,*
*На ўсё вы знойдзеце прычыны.*
*Як гэта цяжка — быць дарослай,*
*Як гэта цяжка — быць жанчынай.*

*Насустрач плёткам і абразам*
*Пранесці горда твар прыгожы,*
*Затое быць з каханым разам,*
*І ў гэтым толькі шчасце, можа.*

*А потым старасць, потым восень,*
*Хаваеш першыя маршчыны.*
*Хоць уваччу ўсё тая ж просінь,*
*Ды сэрца ные без прычыны.*

*Дачка сама адрэжа косы,*
*І рассказаць ёй немагчыма,*
*Як будзе цяжка жыць дарослай,*
*І ў колькі раз цяжэй — жанчынай.*

### РУЧНІКІ

*У суботу Янка ехаў ля ракі,*
*Пад вярбой Алёна мыла ручнікі.*
*«Пакажы, Алёна, броды земляку,*
*дзе тут пераехаць на кані раку?»*
*«Адчапіся, хлопец, едзь абы-куды,*
*не муці мне толькі чыстае вады!»*
*У маркоце Янка галавой панік,*
*упусціла дзеўка беленькі ручнік.*
*«Янка, мой саколік, памажы хутчэй!*
*Бо плыве, знікае ручнічок з вачэй!»*
*«Любая Алёна, я ж вады баюсь!*
*Пацалуй спачатку — што як утаплюсь!»*
*Супыніўся гнеды пад вярбой густой.*
*Цалавала Янку Лена над ракой.*
*Стала ціха-ціха на усёй зямлі,*
*па рацэ далёка ручнікі плылі...*

## ■ Кватэрнае пытанне

### Ёсць патрэба ў паляпшэнні жыллёвых умоў — значыць, ёсць права

***Мы жывём у аднапакаёвай кватэры, пабудаванай з выкарыстаннем ільготнага крэдыту. У мінулым годзе ён быў пагашаны і, паколькі сям'я за гэты час павялічылася, мы хацелі б узяць новы — для будаўніцтва большай кватэры. Ці ёсць у нас такое права?***

**А. Зубаў,** *г. Барысаў.*

Дзейныя нарматыўныя дакументы, якія вызначаюць парадак і ўмовы выдзялення грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) жылых памяшканняў, не змяшчаюць палажэння аб аднаразовасці выдачы такіх крэдытаў.

Ільготныя крэдыты выдзяляюцца грамадзянам, якія знаходзяцца на ўліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў (за выключэннем грамадзян, у дачыненні якіх прызнана, што яны маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па дадатковых падставах, прадугледжаных арганізацыямі ў калектыўных дагаворах) і ўключаны ў вызначаным парадку ў спісы грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і маюць права на атрыманне льготных крэдытаў.

Такім чынам, калі сям'я, пра якую ідзе гаворка, у вызначаным парадку прынята на ўлік асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, то яна пры наяўнасці законных падстаў, прадугледжаных Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2012 г. № 13, можа прэтэндаваць на атрыманне льготнага крэдыту для паляпшэння жыллёвых умоў.

**Віктар САВІЦКІ**

■

## ■ Інфарм-укол

### НЕ ЕШЦЕ ПАДАЗРОНАЕ

Паводле слоў **валеолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алены ГАРНІЦКАЙ**, побач з намі існуюць звыш 100 відаў мікраскапічных агентаў, здольных выклікаць востры інфекцыйны працэс кішэчнага захворвання. Гэта ўзбуджальнікі брушнога тыфу, сальманелёзу, дызентэрыі, халеры і іншых гастраэнтэрытаў бактэрыяльнага і віруснага паходжання. Пераважна вострыя кішэчныя інфекцыі праяўляюцца болем у жываце, рвотай, павышэннем тэмпературы, шматразовым вадкім стулам.

Паводле рэкамендацый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, каб пазбегнуць падобных непрыемнасцяў, варта заўсёды прытрымлівацца пяці рэкамендацый:

1. Падтрымлівайце чысціню (асабістую гігіену).

2. Аддзяляйце прадукты сырыя і гатовыя (карыстайцеся асобным інвентаром, захоўвайце ў асобных ёмістасцях).

3. Добра гатуйце прадукты (мяса, рыба, яйкі павінны быць добра адваранымі або абсмажанымі).

4. Не пакідайце гатовую ежу пры пакаёвай тэмпературы. Не захоўвайце прадукты працяглы час. Ахалоджвайце без затрымкі.

5. Выкарыстоўвайце толькі бяспечныя прадукты і бяспечную ваду. Калі ёсць сумненні, лепш адмоўцеся ад ужывання.

■

# ДЗЯЎЧАТЫ З ХАРАКТАРАМ

**Жаночая зборная Беларусі па баскетболе трымае планку. У 2007 годзе нашы дзяўчаты здзівілі баскетбольную Еўропу і насуперак усім заваявалі бронзу кантынентальнага першынства. Каб пацвердзіць той вынік, сённяшняй камандзе яшчэ доўга працаваць. Аднак выхад з першай пазіцыі ў групе на чарговы чэмпіянат Еўропы — дасягненне, якое выклікае павагу і гонар за характар беларусак. І гэта пры тым, што дзяўчатам прыйшлося змагацца не толькі з моцнымі венгеркамі, ізраільцянкамі, украінкамі, але і з масавай «эпідэміяй» траўмаў, якая літаральна звалілася на каманду. Між іншым, з новага адборачнага цыкла ў зборнай новы трэнер. Выдатнага Анатоля Буяльскага на трэнерскім месцы змяніў літовец Рымантас ГРЫГАС. І калі для большасці заўзятараў ён заставаўся загадкай, яго біяграфія выдавала ў ім цудоўнага спецыяліста.**

Фота БЕЛТА.



Таццяна ТРОІНА і Рымантас ГРЫГАС стаяць за зборную гарой.

Баскетбол для Літвы — што футбол для Бразіліі: «хвароба» масавая і сапраўды невылечная. У Рымантаса не было баскетбольных каранёў. Не, ягоны бацька не гуляў за «Жальгірыс», а працаваў на заводзе, а маці — у гандлёвай сферы. Ён проста закахаўся у баскетбол так, як і іншыя літоўскія хлапчукі. У яго трэнерскай хроніцы — клубы з традыцыямі. Імёны кіеўскага «Будзівельніка» і славутага «Жальгірыса» скажуць многае для любога балельшчыка. І распавесці цікаўнаму журналісту ён сапраўды можа шмат што. Але гутарку са спадаром Грыгасам мы пачалі з пытанняў актуальных, якія найбольш клапоцяць нашых заўзятараў.

— Ведаеце, першае, што неабходна зрабіць дзяўчатам і трэнерам — гэта добра адпачыць, — кажа Грыгас. — Падрыхтоўка да адборачных матчаў першынства Еўропы пачалася адразу пасля завяршэння клубных чэмпіянатаў, і таму дзяўчаты амаль не мелі перапынку. Дарэчы, зараз няшмат часу засталося да старту Алімпіяды, у якой будуць удзельнічаць наймацнейшыя мужчынскія і жаночыя баскетбольныя зборныя. А таму трэба спланаваць час так, каб паглядзець трансляцыі і «хварэць» за свае каманды.

***— Рымантас, у плане вынікаў зборная групы турнір правяла выдатна. З трэнерскага пункту гледжання як ацэніце выступленне? Ці цалкам задаволены якасцю гульні?***

— Вынік мяне вельмі задавальняе: мы занялі першае месца і выйшлі ў фінальны этап. Кожны трэнер хоча, каб каманда ў пэўных кампанентах згуляла лепш. Аднак у нас былі пэўныя моманты, якія не дазволілі нам згуляць у поўную моц. Многія гульцы атрымалі траўмы. Але ў тых матчах, дзе нас перамаглі, мы саступілі з маленькім вынікам. Гэта давала шанц на першае месца.

***— Каманда сапраўды добра стартавала, але пасля саступіла і Венгрыі, і Ізраілю. Што здарылася?***

— Мы выступалі ў вельмі моцнай падгрупе, у якой было чатыры зборныя з добрай гульнёй. Мы саступілі ў гасцях, але змагаліся да апошняга. Было і нешанцаванне, і неаб'ектыўнасць з боку суддзяў, якія крыху падтрымлівалі гаспадароў. У матчы з Венгрыяй напрыканцы было 6 спрэчных свісткоў. Але галоўная прычына — тое, што з асноўнай абоймы выпалі 5 дзяўчат асноўнага складу.

***— Зборная хоць загадзя і забяспечыла выхад на чэмпіянат Еўропы, але каштавала гэта вялікіх фізічных і маральных высілкаў.***

— Так, калі ты губляеш столькі гульцоў, ты губляеш ратацыю ў камандзе. І нам ад гэтага было гуляць больш складана.

***— Вернемся крыху назад. Калі вам прапанавалі ўзначаліць зборную Беларусі, што ведалі пра наш баскетбол?***

— Я рос у Савецкім Саюзе, калі ў Беларусі быў добры жаночы і мужчынскі баскетбол. Шкада, што цяпер традыцыі падтрымліваюць толькі жанчыны. Але, думаю, мужчынскі баскетбол уздымецца таксама. Добра, калі б былі каманды са сваім тварам накшталт вядомага РТІ. Федэрацыя стараецца, каб клубы развіваліся і баскетбол рос. У жаночай зборнай Беларусі былі вельмі добрыя вынікі. Калі я працаваў у Екацярынбургу, там гуляла беларуска Алена Леўчанка. З ёй я ў добрым кантакце і яна прасіла, каб я дапамог зборнай: дала мне шмат інфармацыі пра каманду, яе баскетбалістак. І я неяк спытаў у яе пра характар каманды. Яна сказала: «У іх такія характары, што вам іх яшчэ спыняць давядзецца. Яны змагацца заўжды будуць да апошняга». Так і ёсць.

***— Вы — спецыяліст, які працаваў з шэрагам мужчынскіх камандаў, але цяпер працуеце з жаночай. Лічыце, што баскетбольны трэнер павінен быць універсалам і паспець папрацаваць з рознымі калектывамі?***

— Мяркую, што добры трэнер можа працаваць паўсюль. І ў жаночым баскетболе, у дзіцячым, і ў мужчынскім. Моцны трэнер адразу разумее гульню. І ніякай складанасці ў працы з жаночай зборнай у мяне не ўзнікае.

***— Рымантас, вы неяк прызналіся, што хочаце змяніць філасофію беларускай зборнай. Што мелі на ўвазе?***

— Я не збіраўся змяніць філасофію пад сябе, характар гульцоў. Беларускія дзяўчаты па-спартыўнаму агрэсіўныя, змагаюцца за кожны мяч. Я хацеў агрэсіўную абарону адаптаваць пад іх характар. І гэтага мы ў многіх момантах дасягнулі. Жаночы баскетбол таксама рушыць да таго, што менавіта абарона стане адным з асноўных кампанентаў гульні. Абарона будзе прыводзіць да перамогі, а атака ёй у гэтым дапамагаць.

***— Па падборы выканаўцаў у нас даволі моцная зборная. Але наш чэмпіянат мае толькі некалькі добрых калектываў па інфраструктуры і гульні. У якім кірунку трэба развівацца?***

— Але гэтыя клубы ніжэй за сярэдні ўзровень еўрапейскіх камандаў. Самі ведаеце, як «Гарызонт» згуляў з курскім «Дынама» ў Еўракубку. Гэта крыўдна — саступаць 30 балаў дома і ў гасцях. І гэта не ў Еўралізе, а ў другім па знакавасці турніры. Галоўнае — праца ў клубах. І менавіта ў іх трэба як мага лепш працаваць. Літоўскія каманды таксама не маюць вялікіх бюджэтаў. Яны маюць невялікія фінансавыя магчымасці, але гуляюць у Еўракубку лепей за беларускія клубы.

* * *

***— Рымантас, пытанне з шэрагу неспартыўных. Беларусь і Літва маюць агульнае мінулае. І беларускія турысты наведваюць не толькі літоўскія гіпермаркеты, але і замак у Тракаі, і Вострую браму ў Вільні. А самі дзе любіце бавіць час?***

— Люблю бываць у бацькоў у Клайпедзе. Альбо еду на лецішча, каля якога ёсць возера, лес...

***— У грыбы ходзіце?***

— Часам і грыбы збіраю, але я вельмі люблю рыбу павудзіць.

***— Цікава, а што з нацыянальнай кухні любіце? Ведаю, што ў нас шмат хто прывозіць ад вас пірог шакоціс.***

— Так, гэта наша нацыянальная страва. А я вось нядаўна чуў, як літоўцам сказалі, што дужа любімыя ў нас цэпеліны прыйшлі да нас з Беларусі. Але гэтаму ніхто не паверыў!

**Тарас ШЧЫРЫ.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.02 | 21.29 | 16.27 |
| Віцебск — | 4.44 | 21.26 | 16.42 |
| Магілёў — | 4.51 | 21.20 | 16.29 |
| Гомель — | 4.56 | 21.08 | 16.12 |
| Гродна — | 5.18 | 21.43 | 16.25 |
| Брэст — | 5.27 | 21.36 | 16.09 |

**Месяц**

***Маладзік 19 ліпеня. Месяц у сузор'і Рака.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Варвары, Ганны, Лізаветы, Апанаса, Сяргея.*
***К.*** *Караліны, Арнольда, Емяльяна, Каміля, Шымана.*

## ЗАЎТРА




**Даты | Падзеі | Людзі**



**1195** год — нарадзіўся Міндоўг, першы вялікі князь літоўскі. Ён аб'яднаў у сваіх уладаннях Навагародскую (Навагрудскую) зямлю, усходнія землі Літвы і частку Полацкай зямлі ў адзіную беларуска-літоўскую дзяржаву, якая стала асновай ВКЛ. 6 ліпеня 1253 года Міндоўг прыняў тытул караля ў рэзідэнцыі ў Навагрудку, які тады быў сталіцай Вялікага Княства Літоўскага. Міндоўг атрымаў ад Папы Рымскага Інакенція IV каралеўскую карону. Афіцыйна княства рабілася каралеўствам, што стварала падставы для стабільнасці ў стасунках з еўрапейскімі дзяржавамі. У 1255 годзе Папа Рымскі прызнаў Міндоўгавага сына ягоным пераемнікам і дазволіў каранацыю, і гэта яшчэ больш умацавала пазіцыі Міндоўга ў хрысціянскім свеце. Аднак гэткай еўрапейскай арыентацыі Міндоўг трымаўся нядоўга. Ужо на пачатку 1260-х гадоў ён разарваў пагадненне з Інфлянцкім ордэнам, а потым і з Папам, ды пачаў адкрытую вайну супраць сваіх былых саюзнікаў. У канцы жыцця Міндоўг карыстаўся неабмежаванай уладай у Вялікім Княстве Літоўскім, што выклікала супраць яго змову князёў: жамойцкага Траняты, полацкага Таўцівіла, нальшанскага Даўмонта. У выніку Міндоўга забілі разам з сынамі Рупекам і Руклем.

**1930** год — пачалася дзейнасць Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя І. Жыновіча. Ён быў створаны як Беларускі дзяржаўны ансамбль народных інструментаў. Першым мастацкім кіраўніком і дырыжорам ансамбля быў беларускі музыка і кампазітар Д. Захар. З 1946 года на працягу трыццаці гадоў дзейнасць аркестра была звязана з імем выдатнага музыканта-цымбаліста, дырыжора, народнага артыста Беларусі і СССР Іосіфа Жыновіча. Дзякуючы яму гэты калектыў стаў сапраўдный творчай лабараторыяй нацыянальнага інструментальнага мастацтва. Аркестр унікальны па складзе інструментаў і гучанні. У яго рэпертуары больш за тысячу арыгінальных твораў сучасных беларускіх кампазітараў і кампазітараў-класікаў.

**1946** год — нарадзіўся (вёска Рубель Столінскага раёна) Андрэй Аляксеевіч Каляда, беларускі вучоны ў галіне камп'ютарнай алгебры, інфарматыкі і кібернетыкі, доктар фізіка-матэматычных навук (1990). Аўтар навуковых прац па тэорыі, метадах, праграмна-апаратных і апаратных сродках арганізацыі паралельных вылічэнняў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1991).

**Было сказана**

**Максім ТАНК (1912—1995), народны паэт Беларусі:**

***«Чалавек памірае, калі страчвае здольнасць здзіўляцца і захапляцца жыццём».***

## УСМІХНЕМСЯ

— Дарагі, я села на дыету, таму буду есці толькі лобстараў, труфелі і амараў!
— Ды чаго ты разменьваешся на дробязі — еш ужо адразу грошы!

**Цікава, што варта толькі звычайнаму чалавеку трапіць да ўрача, як у яго знаходзяць з дзясятак захворванняў. А калі да ўрача трапляе малады чалавек прызыўнога ўзросту, ён становіцца здаровым і прыгодным да службы ў войску.**

Студэнты.
— Так, лайцеся на мяне, у мяне заўтра экзамен.
— Дурань, экзамен у цябе быў учора!..

**Добра так учора пасядзелі, а чый дзень нараджэння хоць быў?.. Як вяселле?.. Як маё?!**

— Дарагая, ты якую каву хацела б?
— Я хацела б моцную, але мяккую і пяшчотную, якая перавярнула б усю мяне дагары нагамі, адкрыла для мяне свет спакусы і бязмежнай чуллівасці, закружыла б і дадала пярэстую гаму дагэтуль невядомых пачуццяў...




— Чуеш, можа табе проста гарэлкі наліць?..

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У.ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н.КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л.ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С.ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, Л.РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л.СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 27.631. Індэкс 63850. Зак. № 3189.
Нумар падпісаны ў 19.30 17 ліпеня 2012 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12